# Паштовая марка «25-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан»

16 верасня 2017 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «25-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан».
Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан. Дызайн Т.Кузняцовай.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (магазін «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

*Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан усталяваны 16 верасня 1992 года.*
*Дагаворна-прававая база казахстанска-беларускага супрацоўніцтва налічвае больш за 70 дагавораў і пагадненняў у розных галінах: вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі, аховы здароўя, грамадзянскай абароны, прадухілення і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, турызму, архіўнай справы, а таксама ў галіне сельгасмашынабудавання, сумеснай вытворчасці лекавых сродкаў, дзіцячага харчавання, малочнай прадукцыі.*
*Стрыжнем двухбаковых адносін застаецца гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва.*

Падрабязнасці на сайце РУП «Белпошта»

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/13-09-2017-2287*